● СТРАТА

# ПРАФЕСАР. ВУЧОНЫ. ПЕДАГОГ

***Няпоўных 12 гадоў (1997 – 2009) наш універсітэт узначальваў доктар гістарычных навук, прафесар Аркадзь Уладзіміравіч Русецкі. З 2009 па жнівень 2020 года ён працаваў прафесарам кафедры ўсеагульнай гісторыі і сусветнай культуры. А 10 студзеня 2021 года, на жаль, пайшоў з жыцця.***

Аркадзь Уладзіміравіч быў акадэмікам Беларускай акадэміі адукацыі; акадэмікам Міжнароднай акадэміі навук вышэйшай школы (г. Масква); акадэмікам Міжнароднай акадэміі навук інфармацыі, інфармацыйных працэсаў і тэхналогій (г. Масква); членам Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу другога склікання; членам Агульнага сходу Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі; членам Савета Беларускага рэспубліканскага фонда фундаментальных даследаванняў; членам Савета Спецыяльнага фонда Прэзідэнта Беларусі па рабоце з адоранай моладдзю; членам Саюза пісьменнікаў Беларусі.

Аркадзь Уладзіміравіч – вядомы навуковец, аўтар шматлікіх навукова-даследчых работ па тэорыі і гісторыі мастацкай культуры Беларусі, гісторыі Віцебска і Віцебскай вобласці, праблемам развіцця вышэйшай адукацыі і г.д.; аўтар і сааўтар кніг, сярод якіх «Художественная культура Витебска с древности до 1917 года», «Уладзімір Караткевіч: яго зорка не згасне ніколі» і інш.

Акрамя таго, прафесар быў унесены ў кнігу «Great mans of the XXI-h century» («Вялікія людзі XXI стагоддзя»), якая выйшла ў Амерыканскім біяграфічным інстытуце Паўночнай Караліны.

За час рэктарства Аркадзя Русецкага наш універсітэт стаў класічным і яму было прысвоена імя вядомага выпускніка Пятра Міронавіча Машэрава. Сваю працу аднавіў гістарычны факультэт, адкрыліся ваенная кафедра, юрыдычны факультэт, Інстытут павышэння кваліфікацыі і перападрыхтоўкі кадраў, шэраг новых спецыяльнасцяў, былі створаны санаторый-прафілакторый і жаночая футбольная каманда «Універсітэт», якая шэсць гадоў запар перамагала на першынстве Беларусі. Акрамя таго, быў адноўлены выпуск універсітэцкай газеты, якая атрымала назву «Мы і час» і была зарэгістравана ў Міністэрстве інфармацыі.

Таксама ў гэтыя гады ля ўваходу ва ўніверсітэт з'явілася скульптурная алея адных з першых выкладчыкаў нашай навучальнай установы, а ў 2000-х быў устаноўлены Памятны знак выкладчыкам і студэнтам, якія загінулі ў гады Вялікай Айчыннай вайны.

Плённая прафесійная, навуковая і грамадская дзейнасць прафесара была адзначана ордэнам «Знак Пашаны», медалём Францыска Скарыны, ордэнам Андрэя Першазваннага, нагрудным знакам «Выдатнік адукацыі» і іншымі ўзнагародамі.



Калектыў універсітэта глыбока смуткуе ў сувязі са смерцю прафесара і выказвае шчырыя спачуванні яго родным і блізкім.

Светлая памяць пра Аркадзя Уладзіміравіча, таленавітага вучонага і пісьменніка, інтэлігентнага і мудрага чалавека, прафесіянала сваёй справы, кампетэнтнага суразмоўцу і строгага выкладчыка назаўсёды застанецца ў сэрцах тых, хто яго ведаў.

● НАЛОГОВАЯ ИНФОРМИРУЕТ

# ТРАНСПОРТНЫЙ НАЛОГ – КРАТКО О НОВОМ!

С 2021 года физические лица, за которыми в ГАИ МВД Республики Беларусь зарегистрированы транспортные средства, будут уплачивать транспортный налог.

При этом, физическими лицами, уплатившими до 1 января 2021 года государственную пошлину и получившими разрешение на допуск транспортного средства к участию в дорожном движении, транспортный налог будет уплачиваться пропорционально количеству месяцев, следующих за месяцем, в котором истек срок действия такого разрешения.

Законодательством определен перечень транспортных средств, за которые налог не уплачивается: год выпуска которых 1991 год и ранее либо сведения о годе выпуска которых отсутствуют; снятые с учета в ГАИ МВД до 1 июля 2021 года; находящиеся в угоне; специально оборудованные для использования инвалидами.

Транспортный налог подлежит уплате за каждое транспортное средство вне зависимости от участия его в дорожном движении, размер ставки налога зависит от разрешенной максимальной массы, вместимости транспортного средства (например, автобус с числом посадочных мест до 20 включительно) либо определяется за одну единицу транспортного средства (например, мотоцикл).

Также определена категория физических лиц, имеющих право на уменьшение суммы налога:

– на 50 процентов в отношении транспортных средств, зарегистрированных за ветеранами Великой Отечественной войны, инвалидами I или II группы, лицами, достигшими общеустановленного пенсионного возраста, или лицами, имеющими право на пенсию по возрасту со снижением общеустановленного пенсионного возраста;

– на 25 процентов – для инвалидов III группы.

Льгота по снижению ставки транспортного налога предоставляется при наличии у физического лица действительного водительского удостоверения соответствующей категории.

Кроме того, физические лица, находящиеся в трудной жизненной ситуации, вправе получить полное или частичное освобождение от уплаты транспортного налога по транспортным средствам, не используемым в предпринимательской деятельности.

Уплата транспортного налога будет производиться за истекший календарный год на основании извещения, вручаемого не позднее 1 сентября. Срок уплаты – 15 ноября года, следующего за истекшим.

В то же время Налоговым кодексом установлены особенности уплаты транспортного налога за 2021 год.

Так, физические лица, не получившие по состоянию на 1 января 2021 года разрешение на допуск транспортного средства к участию в дорожном движении, обязаны будут уплатить не позднее 15 декабря 2021 года авансовый платеж в размере одной базовой величины, а в отношении прицепа, прицепа-дачи (каравана) и мотоцикла – в размере 20 бел. рублей за каждый объект налогообложения.

Извещение на такие платежи будет направлено налоговым органом не позднее 1 ноября 2021 года. Доплату транспортного налога за 2021 год потребуется произвести не позднее 15 ноября 2022 года на основании извещения налогового органа, которое будет вручено не позднее 1 сентября 2022 года.

**Отдел информационно-разъяснительной работы инспекции МНС по Первомайскому району г. Витебска.**

МЫ І ЧАС

Газета зарэгістравана ў Міністэрстве інфармацыі 27.10.2009 г. Рэг. № 747.

ГАЗЕТА ЎСТАНОВЫ АДУКАЦЫІ «ВІЦЕБСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ ЎНІВЕРСІТЭТ імя П.М. МАШЭРАВА»

Адрас рэдакцыі: 210038, г. Віцебск, Маскоўскі пр-т, 33. Тэл. 37-33-79. Эл. пошта: gazeta@vsu.by
Газета надрукавана афсетным спосабам ва УПП «Віцебская абласная друкарня». ЛП 02330/116 ад 27.03.2014 г.
Вул. Шчарбакова-Набярэжная, 4, Віцебск, 210015.
Падпісана да друку 27.01.2021 г. у 16.30. Тыраж 760. Аб'ём 2 друк. арк. Зак. 433.

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні неабавязкова адлюстроўваюць пункт гледжання рэдакцыі.

Газета выходзіць адзін раз на месяц.

Галоўны рэдактар В.В. БАГАТЫРОВА

Рэдактар А.А. ДУБРОЎСКАЯ